# *§ 16–0. Барацьба супраць знешніх заваёўнікаў

**Качэўнікі Паўночнага Прычарнамор'я.** Стэпавыя прасторы Паўночнага Прычарнамор'я здаўна вабілі качэўнікаў. Тутэйшыя прыродныя ўмовы дазвалялі займацца качавой жывёлагадоўляй. Пры гэтым тыпе гаспадарання жывёлу перыядычна пераганялі з адной пашы на другую. Разам з жывёламі вандравалі і людзі.

На працягу некалькіх стагоддзяў сюды прыходзілі розныя качавыя народы: венгры, печанегі, торкі, полаўцы. Яны адрозніваліся адны ад другіх не толькі імёнамі. Нехта з іх быў больш ваяўнічы і жорсткі, хтосьці дасягнуў высокага майстэрства ў дэкаратыўнапрыкладным мастацтве. Некаторыя качэўнікі выгольвалі галаву і пакідалі тры коскі валасоў, іншыя фарбавалі валоссе ў руды колер. Але мелі яны і шмат агульнага.

Качавая жывёлагадоўля вызначала лад жыцця стэпавікоў. Жылі яны ў жытлах, якія лёгка разбіраліся, — юртах (на Русі іх называлі вежамі). Шмат часу праводзілі верхам, з малых гадоў прывучваліся да сядла. Конь даваў качэўнікам асноўныя прадукты: малако і мяса.

Качавая гаспадарка развівалася надзвычай марудна, бо яна не патрабавала значных удасканаленняў. Тым не менш пэўныя зрухі адбываліся. Так, на зімовы час качэўнікі заставаліся на адным месцы, у сваіх «вежах». З'яўляюцца і сталыя паселішчы.

Жыццё качэўнікаў вельмі моцна залежала ад умоў надвор'я. Калі доўга не было дажджоў, у стэпе высыхала трава. Коні заставаліся без пракорму, што ставіла пад пагрозу і жыццё людзей. Качэўнікі вымушаны былі шукаць новыя пашы. Гэта рабілася адной з прычын сутыкненняў качэўнікаў з земляробчымі народамі.

Вайна была звычайным заняткам стэпавікоў. Яны часта чынілі грабежніцкія набегі на суседзяў. Здаралася, у пошуках месцаў для жыцця качэўнікі знішчалі цэлыя дзяржавы. Часам яны падпарадкоўвалі земляробаў і паступова мяшаліся з імі.

У X ст. стэпы ахапіла смяротная засуха. Менавіта ў гэты час качавая арда печанегаў заняла прычарнаморскія стэпы. Печанегі зрабіліся найбольш зацятымі ворагамі Кіеўскай Русі.

1. Якія качавыя народы насялялі стэпы Паўночнага Прычарнамор’я?
2. Як качавая жывёлагадоўля ўплывала на лад жыцця?
3. Уявіце сябе качэўнікам, які жыве ў Паўночным Прычарнамор’і ў X ст. Апішыце свой дзень, раскажыце пра тое, як вы даглядаеце сваю жывёлу, як бавіце час у дарозе і як перамагаеце цяжкасці, выкліканыя ўмовамі надвор’я.